Пазнаёміліся з дэлегатамі УНС, якія прадстаўляюць мясцовыя Саветы

16.04.2024 18:16

Аўтар: Аляксандра Гвоздзева (/be/author/alyaksandra-gvozdzeva) / Наталля Капрыленка (/be/author/natallya-kaprylenka) / Нэлі Зігуля (/be/tags/neli-zigulya) / Святлана Яскевіч (/be/tags/svyatlana-yaskevich)

Грамадства (/be/gramadstva)

Роўна праз тыдзень пачне сваю работу Усебеларускі народны сход, які, паводле Канстытуцыі, цяпер набыў статус найвышэйшага органа народнай улады. Сярод 1200 яго дэлегатаў — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў нашай краіны, кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў і жыхары невялікіх вёсак. Мы вырашылі бліжэй пазнаёміцца з дэлегатамі УНС з розных куточкаў Беларусі. Нашы ўласныя карэспандэнты пагаварылі з тымі, хто быў выбраны на прадстаўнічы сход ад мясцовых Саветаў. Гэтых людзей аб'ядноўвае любоў да месца, дзе яны жывуць, і клопат аб тым, каб малая радзіма жыла і развівалася.

«Без сваіх аднавяскоўцаў я наогул нічога не дабілася б у жыцці»

«Людзі вельмі прасілі, я і пайшла...» Так аб пачатку сваёй дэпутацкай дзейнасці на вёсцы расказвае Наталля Пінчук. Наталля Пятроўна — дэпутат Паселіцкага сельсавета — дэлегат Усебеларускага народнага сходу, на якім будзе прадстаўляць родны Хойніцкі раён Гомельшчыны.

(https://declarant.by/ru



Фота з архіва гераіні

Жыве і працуе народная выбранніца ў вёсцы Звяняцкае Паселіцкага сельсавета. Наталля Пінчук — загадчыца філіяла «Звяняцкі сельскі клуб-бібліятэка» Хойніцкага раённага дома культуры.

«Вельмі адказная, уважлівая, спагадлівая да людзей. Усе яе так і называюць — «Наша Наташа» — і душэўна расказваюць пра свайго дэлегата ў раённым Савеце дэпутатаў.

> Паселіцкі сельсавет, на тэрыторыі якога жыве і працуе Наталля Пінчук, другі па велічыні ў Хойніцкім раёне і найбольш пацярпелы ад аварыі на ЧАЭС. Практычна ўсе населеныя пункты сельсавета ў свой час трапілі пад абавязковае адсяленне. Колькасць насельніцтва і ў цэлым домаўладанняў на гэтай тэрыторыі зменшылася амаль у чатыры разы.

— Сама родам з вёскі Веляцін. Выйшла замуж і пераехала ў Звяняцкае, дзе і жыву ўжо 15 гадоў.

У вёсцы ў нас — 83 чалавекі. Дзяцей да 18 гадоў — каля трыццаці чалавек. Ёсць шматдзетныя сем'і, шмат людзей шаноўнага ўзросту, — расказвае Наталля Пятроўна.

Больш чым дзесяць гадоў яна працуе загадчыцай мясцовага клуба-бібліятэкі. Амаль увесь гэты час заставалася і ўпаўнаважаным старшыні Паселіцкага сельсавета па вёсцы Звяняцкае. Шэсць гадоў таму вяскоўцы вылучылі Наталлю Пінчук у дэпутаты сельскага Савета дэпутатаў.

У іх вёсцы няма ўстановы адукацыі: дзяцей у школу і сад дастаўляюць на аўтобусе ў цэнтр сельсавета — Паселічы. Гандаль забяспечвае мабільны комплекс ад крамы буйной гандлёвай сеткі, якая працуе ў райцэнтры. У свой час як дэпутат менавіта Наталля звяртала ўвагу мясцовых улад на вырашэнне гэтага пытання. Галоўнымі сацыяльна значнымі аб'ектамі для вяскоўцаў Звяняцкага застаюцца клуб-бібліятэка і фельчарска-акушэрскі пункт.

> — Прыходзяць з навінамі, ідэямі, пытаннямі, праблемамі, калі нешта трэба ці штосьці здараецца. Бывае, калі позна ўвечары хто са старых дрэнна сябе адчувае, таксама тэлефануюць адразу мне. Прыбягу і ціск артэрыяльны памераю, і «хуткую» выклікаю, калі трэба. Чацвёрты год, як села за руль, дык у нас ужо свае рытуалы: толькі ад'еду з двара, ужо мае вяскоўцы бачаць, што машыны няма, значыць, у горад паехала, тэлефануюць, просяць штосьці прывезці. Просяць і ў бальніцу адвезці ці даставіць у горад, калі штосьці трэба, — шчыра апісвае сваё вясковае жыццё-быццё Наталля Пятроўна. — Мая важная задача — перадаць у сельсавет, што неабходна маім вяскоўцам, чым трэба дапамагчы. Напрыклад, узімку дарогу пачысціць ад снегу, па вясне — прагрэйдзіраваць.

Іх вёска цягнецца ўздоўж доўгай цэнтральнай вуліцы, што таксама ўплывае на работу дэпутата.

— Прыязджае мабільная крама, ведаю, што ўсе там збіраюцца, таму абавязкова іду. Агучваюць, у каго якія навіны, у каго якія цяжкасці, якія ёсць просьбы, — тлумачыць Наталля Пінчук.

Між тым дазнаюся, што менавіта мясцовыя жыхары Звяняцкага вылучаюцца вельмі актыўнай падтрымкай мясцовых органаў кіравання і самакіравання. Шчыра «хварэюць» за свой населены пункт, дапамагаюць у добраўпарадкаванні. Так, аднымі з першых у сельсавеце цалкам сваімі сіламі добраўпарадкавалі мясцовыя могілкі. Падключыліся да гэтай справы фінансава нават ураджэнцы вёскі, якія ўжо многія гады жывуць у розных краінах свету, але ўсё роўна памятаюць родную вёску і жадаюць, каб яна жыла, квітнела і прыгажэла.

> Аб'ядноўвае, натхняе на актыўнасць жыхароў і ўраджэнцаў Звяняцкага якраз дэпутат Наталля Пінчук. Яе сям'я і аднавяскоўцы ганарацца, што іх Наталлю выбралі дэлегатам Усебеларускага народнага сходу.

(https://declarant.by/ru/)

— Без сваіх адна вяскоўцаў я наогул нічога не дабілася б у жыцці. Я і як дэпутат адбылася, дзякуючы таму, што яны са мною і за мяне. Ці то на суботнікі клічу, ці то на любое мерапрыемства, любую ідэю прапаноўваю — усе падтрымліваюць. Вельмі ўдзячная ім, — дзеліцца Наталля Пятроўна. — Калі сабраліся ў нашым сельсавеце на сход з нагоды вылучэння кандыдатаў у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу і ўсе прапанавалі маю кандыдатуру, я была проста ў шоку. Ніколі не магла падумаць, што ў маім жыцці ўвогуле можа такое адбыцца. Была пад вялікім уражаннем, калі разам са старшынёй Хойніцкага раённага Савета дэпутатаў Людмілай Рудчанка прымалі ўдзел у сесіі абласнога Савета дэпутатаў, калі праходзіла галасаванне за кандыдатаў у дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. Калі назвалі маё імя, вельмі хвалявалася, бо гэта такі гонар, а разам з тым такая вялікая адказнасць перад жыхарамі не толькі сваёй вёскі, а раёна, вобласці, краіны. Безумоўна, мяне хвалюе развіццё раёнаў Гомельскай вобласці, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, але і ў цэлым развіццё сельскіх тэрыторый, лёс нашай беларускай вёскі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА

З любоўю да роднай мясціны

Таццяна Пішч дбае аб захаванні культурнай спадчыны: песень, танцаў, мовы, традыцый

Загадчыца Навасёлкаўскага сельскага дома культуры Ляхавіцкага раёна Таццяна Пішч у якасці дэлегата УНС прадстаўляе Ляхавіцкі раённы Савет дэпутатаў, які яе ў свой час вылучыў. У сваім раёне Таццяна Аляксееўна чалавек вельмі вядомы. Без яе і калектыву «Вечарніца», якім яна кіруе, не абыходзіцца ніводнае свята. Сама яна лёгка мяняе вобразы, паспяхова выступае на сцэне ў розных амплуа, але адзін вобраз — ляхавіцкай Лявоніхі — стаў яе своеасаблівай візітоўкай. Гэты вобраз палюбіўся ўсім гледачам.



Фота з архіва Таццяны Пішч

На «Дажынках», іншых фестывалях, аглядах мастацкай самадзейнасці публіка заўсёды чакае Лявоніху і не шкадуе апладысментаў. А з народным ансамблем гумару і песні «Вечарніца» калектыў пабываў на гастролях не толькі ў розных рэгіёнах нашай краіны, але і за яе межамі. «Вечарніцу» чакаюць камбайнеры ў полі, жывёлаводы падчас перазменкі, жыхары вёсак, у якіх засталося да дзясятка чалавек. І ансамбль не падманвае чаканні, прыязджае, каб выступіць перад землякамі, стварыць добры настрой, акунуць працаўнікоў у атмасферу прыгажосці, музыкі. І гэта не проста работа Таццяны Пішч цягам 35 гадоў, гэта стыль яе жыцця.

> Таццяна Аляксееўна расказала, што любоў да народных песень, танцаў, жартаў, прыпевак у яе ад бацькоў, жыхароў вёскі Вялікае Падлессе. Бацька шмат гадоў спяваў у хоры, створаным некалі знакамітым Генадзем Цітовічам. Маленькая Таня сядзела на рэпетыцыях ды натхнялася народнай творчасцю, народнай мудрасцю. Ну як жа Таццяне было не прадоўжыць справу землякоў, справу культурнай асветы?!

Цяпер у яе, акрамя «Вечарніцы», ёсць дзіцячы фальклорны калектыў, аматары якога некалі падхопяць пачэсную і патрэбную справу. На гэта ў Таццяны Аляксееўны вялікія спадзяванні. З юнымі артыстамі яны не толькі развучваюць песні і танцы, але і вывучаюць народныя абрады, святы, гісторыю малой радзімы, удзельнічаюць у аўтапрабегах і іншых мерапрыемствах патрыятычнага кірунку.

— Разумею, што быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу — даволі адказная місія, — разважае Таццяна Пішч. — Для мяне ўсё гэта будзе ўпершыню. Ведаю, што на форуме ў першую чаргу будуць узняты пытанні палітыкі, эканомікі, бяспекі краіны, сацыяльнага развіцця. Думаю, што блок пытанняў, звязаных з захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны, таксама будзе на парадку дня. Апошняе вельмі важна для выхавання нашага падрастаючага пакалення. Бачу гэта ў стасунках са сваімі юнымі выхаванцамі. Калі расказваеш, паказваеш на прыкладах, тлумачыш дзецям важнасць ведання сваёй гісторыі, сваіх вытокаў, яны адклікаюцца: пачынаюць думаць, разважаць, цаніць сваё, роднае. Зразумела, што любоў да Радзімы пачынаецца з любові да роднай мясціны, матчынай мовы, бабулінай калыханкі. Перакананая, што абсалютная большасць маіх калег-дэлегатаў неабыякавыя да названых тэм.

— Яшчэ адна актуальная тэма сённяшняга дня датычыцца ўзрастання ролі мясцовага самакіравання, — працягвае Таццяна Пішч. — Дзесяць гадоў землякі аказваюць мне давер і выбіраюць старастай вёскі Навасёлкі. Цяпер наша вёска мае статус аграгарадка, яна з'яўляецца цэнтрам сельсавета, а таксама сельгаспрадпрыемства. На тэрыторыі маюцца школа, установа аховы здароўя, уся неабходная інфраструктура. Разам з сельвыканкамам, вясковым актывам мы вырашаем розныя надзённыя праблемы, праводзім суботнікі і працоўныя акцыі па добраўпарадкаванні, дбаем пра тое, каб жылося больш камфортна. Мяркую, што на дзяржаўным

(https://nesciarenka.by/)

нароўчы будзе ўзяты курс на далейшую падтрымку органаў мясцовай улады, у тым ліку і матэрыяльную падтрымку, а таксама на павышэнне яе прэстыжу. Трэба рабіць усё, каб жыццё ў вёсцы станавілася больш прывабным, каб маладыя не імкнуліся абавязкова з'язджаць у гарады. Думаю, што ў дэлегатаў з розных рэгіёнаў ёсць свае меркаванні на гэты конт. Цікава будзе імі абмяняцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ

«Напарадзе шмат работы і адчуванне вялікай адказнасці»

Спыталі ў дэлегатаў УНС ад Магілёўскай вобласці, з чым яны ідуць на народнае веча

Дэпутат Мсціслаўскага райсавета і Падсолтаўскага сельсавета Алена Хліманкова:

— Я настаўніца рускай мовы і літаратуры Падсолтаўскай школы і адначасова працую педагогам-арганізатарам. Раблю ўсё для таго, каб выхаваць у школьнікаў пачуццё адданасці сваёй малой радзіме, любові да яе. З «пярвічкамі» БРСМ і піянерскай арганізацыі рэалізуем праекты экалагічнага кірунку. Ёсць у нас праект «Зялёная стужка», падчас якога мы робім 15-хвілінныя забегі па паркавай або лясістай зоне і збіраем смецце. Другасную сыравіну, напрыклад ПЭТ-бутэлькі, здаём і атрымліваем грошы на карысныя мэты. Робім невялічкія ролікі, як мы на бягу збіраем смецце, як яго сартуем і пад якім-небудзь яркім лозунгам (а прыдумаць яго — гэта яшчэ адна з умоў праекта) размяшчаем у інтэрнэце і сацыяльных сетках. Шмат праводзім мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці. Сёлета на ўрачыстым мітынгу, прысвечаным 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, намі будзе прадстаўлена тэатралізаваная патрыятычная кампазіцыя «Вайна-3D» з элементамі рэканструкцыі трагічных падзей, якія адбыліся ў лютым 1942 года ў вёсцы Шамава Падсолтаўскага сельсавета — масавы расстрэл яўрэяў. Звяртанне да такіх падзей вучыць дзяцей берагчы свой родны край, адчуваць адказнасць за яго захаванне, любіць вёску і не здраджваць ёй.



Сама жыву ў невялічкай вёсцы Несцерава і вельмі хачу, каб яна існавала заўсёды і ніколі не знікла. Спадзяюся, падчас работы ў якасці дэлегата УНС знайсці аднадумцаў, якія таксама заклапочаны ідэяй захавання беларускай вёскі. Магчыма, хтосьці з іх ужо ведае, як гэта зрабіць і мае напрацоўкі. Буду набірацца вопыту, слухаць калег. Наогул, вельмі хвалюючы і адказны быць дэлегатам такога вялікага сходу. Чула, што яно нават праходзіць будзе незвычайна. Вельмі цікава ўбачыць усё на свае вочы і прычыніцца да гэтага.

Старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана Язерская:

— Я вельмі ўдзячная за давер нашых жыхароў, якія вылучылі мяне ў якасці дэлегата на Усебеларускі народны сход. Гэта значыць, што ў найбліжэйшыя пяць гадоў я змагу ў гэтым ганаровым статусе ўдзельнічаць у вырашэнні стратэгічных пытанняў для нашай краіны. Напарадзе шмат работы і ёсць адчуванне вялікай адказнасці. Мы жывём у няпростым свеце, вельмі неспакойным. Усё, што адбываецца вакол Беларусі, стварае напружанасць, неспакой у жыхароў краіны — наша задача здымаць гэтыя пытанні. Рашэнні, якія мы прымаем, будуць накіраваныя на захаванне міра і развіццё эканомікі. Болей нічога і не трэба. Калі будзе спакойнае жыццё, мы зможам спакойна развівацца.

(https://declarant.by/ru/)



Старшыня Магілёўскага гарсавета Максім Гурын:

— Усебеларускі народны сход атрымаў канстытуцыйны статус, і мы першыя, хто мае магчымасць працаваць у рамках яго і адстойваць інтарэсы краіны, яе стратэгію развіцця і нацыянальную бяспеку. Прэзідэнт заўсёды падкрэслівае, што мы робім усё для таго, каб забяспечваць спакой і камфорт для нашых грамадзян. І гэты сход для мяне перш за ўсё адказнасць, асабісты ўнёсак у агульную справу. Будзем разам з іншымі дэлегатамі працаваць на карысць краіны і дзеля міру ва ўсім свеце.



Нэлі ЗІГУЛЯ

Весці наперад сваім прыкладам

Святлана Язерская за развіццё населеных пунктаў і сельскай гаспадаркі

У лік 44 дэлегатаў на Усебеларускі народны сход ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Віцебскай вобласці ўвайшла галоўны заатэхнік ААТ «Птушкафабрыка Гарадок» Святлана Язерская.

(https://declarant.by/ru/)



Фота ТК «Гарадоцкі раён. Афіцыйна»

Святлана родам з вёскі Філімонава Гарадоцкага раёна. Прыказкай «Дзе нарадзіўся — там і згадзіўся» ўлада тлумачыць прафесійныя поспехі жанчыны. У 2021 годзе за шматгадовую добрасумленную працу і асабісты ўклад у развіццё птушкагадоўлі яе імя было занесена на раённую Дошку гонару.

Пасля заканчэння Даўгапольскай сярэдняй школы яна ў Віцебску атрымала спецыяльнасць «кандытар трэцяга разраду» і на працягу пяці гадоў працавала на хлебазаводзе ў паўночнай сталіцы. На змену прафесіі ў бок сельскай гаспадаркі паспрыяла сям'я — Святлана выйшла замуж і разам з мужам пераехала ў Гарадок у далёкім 1994 годзе, пачала пісаць працоўны летапіс на птушкафабрыцы.

У 2006 годзе скончыла Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны, стала заатэхнікам. На працягу амаль 20 гадоў займала пасаду галоўнага тэхнолага прадпрыемства, а цяпер шчыруе галоўным заатэхнікам. У абавязкі Святланы Аляксееўны ўваходзіць складанне тэхналагічнай праграмы па вытворчасці прадукцыі птушкагадоўлі на год, кіраўніцтва тэхналагічным працэсам утрымання і харчавання птушкі, а таксама кантроль работы заатэхнічнай службы.

Сучаснае абсталяванне дазволіла сёння павялічыць пагалоўе і павысіць вытворчасць працы. Усе асноўныя працэсы на фабрыцы аўтаматызаваныя. Асаблівым гонарам жанчына лічыць тое, што ААТ «Птушкафабрыка Гарадок», павялічваючы асартымент прадукцыі за кошт сучасных тэхналогій вытворчасці, актыўна ўваходзіць у буйныя гандлёвыя сеткі нашай краіны. І, вядома, зладжаны калектыў, які стаіць за якаснай і натуральнай прадукцыяй, таксама з'яўляецца складнікам поспеху буйнога сельскагаспадарчага прадпрыемства.

> Калегі характарызуюць Святлану Аляксееўну як чалавека вельмі адказнага і неабыякавага да сваёй дзейнасці. Такія адносіны да прафесіі склаліся са шляху, які прайшла гераіня на прадпрыемстве ад птушніцы да галоўнага заатэхніка. Сваімі рукамі і вопытам і яна дакладна вывучыла ўсе этапы вытворчасці, таму цяпер да кіравання падыходзіць рацыянальна і ўзважана.

Сёлета Святлана Язерская будзе прадстаўляць інтарэсы жыхароў раёна на Усебеларускім народным сходзе ад Гарадоцкага раённага Савета дэпутатаў. «Стаць дэлегатам УНС — гэта вельмі пачэсна і адказна. Тым больш што сход пройдзе ў новым фармаце пасля мінулага рэферэндуму. Як чалавеку з вёскі, мне блізкія клопаты сельскіх жыхароў. Як сказаў наш Прэзідэнт, калі знікнуць маленькія гарады і вёскі, то можа знікнуць уся краіна, бо не будзе каму займацца сельскай гаспадаркай. Хочацца, каб ствараліся найбольш камфортныя ўмовы для іх жыцця і рэалізацыі: рабочыя месцы, якасныя дарогі, даступная ахова здароўя. Думаю, што на УНС гэтыя актуальныя пытанні будуць уздымацца», — падкрэсліла дэлегат.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА

Чытайце таксама

Ганна Бойка: Сакрэт поспеху — любіць тое, што робіш (/be/news/20240613/1718275958-ganna-boyka-sakret-pospehu-lyubic-toe-shto-robish)

Ірына Даўгала: Сям'я для беларусаў застаецца найвышэйшай каштоўнасцю (/be/news/20240612/1718198838-iryna-daugala-syamya-dlya-belarusau-zastaecca-nayvysheyshay-kashtounascyu)

«УНС — гэта палітычная ядзерная зброя» (/be/news/20240523/1716481006-lukashenka-nazvau-uns-palitychnay-yadzernay-zbroyay-belarusi)

Захаваць культурны код беларускай нацыі (/be/news/20240503/1714738092-zahavac-kulturny-kod-belaruskay-nacyi)

«Рашэнні сходу будуць на карысць людзям і дзяржаве» (/be/news/20240430/1714491912-rashenni-shodu-buduc-na-karysc-lyudzyam-i-dzyarzhave)

Тэгі:

УНС (/be/tags/uns) | мясцовыя Саветы дэпутатаў (/be/tags/myascovyya-savety-deputatau-0) | Наталля Пінчук (/be/tags/natallya-pinchuk) | Таццяна Пішч (/be/tags/taccyana-pishch) | Алена Хліманкова (/be/tags/alena-hlimankova) | Святлана Язерская (/be/tags/svyatlana-yazerskaya) | Максім Гурын (/be/tags/maksim-guryn)

Падзяліцца:
(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20240416%2F1713280578-paznayom
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20240416%2F1713280578-paznayo
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%9F%D0%B0%D0%B7%D0%BD%D0%B0%D1%91%D0%BC%D1%96%D0%
(viber://forward?text=%D0%9F%D0%B0%D0%B7%D0%BD%D0%B0%D1%91%D0%BC%D1%96%D0%BB%D1%96%
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20240416%2F1713280578-paznayomilisy

Навіны Папулярнае

14:52 Генпракуратура запатрабавала ад Wildberries спыніць продаж беспілотнікаў фізічным асобам (/be/news/20241001/1727783553-genprakuratura-zapatrabavala-ad-wildberries-spynic-prodazh-bespilotnikau)

14:13 Чым скончылася «Расонскае сафары» на верталёце? (/be/news/20241001/1727779377-chym-skonchylasya-rasonskae-safary-na-vertalyoce)

13:46 Памёр кампазітар і спявак Вячаслаў Дабрынін (/be/news/20241001/1727779580-pamyor-kampazitar-i-spyavak-vyachaslau-dabrynin)

13:28 Міністэрства інфармацыі абмежавала доступ да інтэрнет-рэсурсу okko.tv (/be/news/20241001/1727778534-ministerstva-infarmacyi-abmezhavala-dostup-da-internet-resursu-okkotv)

13:06 Байдэн пачаў перажываць з-за ўсеагульнага забыцця (/be/news/20241001/1727777197-bayden-pachau-perazhyvac-z-za-useagulnaga-zabyccya)

12:48 У Беларусі зафіксаваны самыя нізкія стаўкі па крэдытах сярод краін ЕАЭС (/be/news/20241001/1727776105-u-belarusi-samyya-nizkiya-stauki-pa-kredytah-

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Востраў здароўя і «Вясёлкавы свет» (/be/news/20240904/1725457271-vostrau-zdarouya-i-vyasyolkavy-svet)

Наталля Качанава сустрэлася з дэпутацкім корпусам Віцебшчыны (/be/news/20240904/1725453488-kachanava-pravyala-u-polacku-sustrechu-z-deputatami-vicebskay-voblasci)

Віцебшчына прэзентавала свой эканамічны, культурны і гістарычны патэнцыял (/be/news/20240902/1725290120-vicebshchyna-prezentavala-svoy-ekanamichny-kulturny-i-gistarychny)

Аляксандр Субоцін правёў асабісты прыём грамадзян (/be/news/20240902/1725289804-alyaksandr-subocin-pravyou-asabisty-pryyom-gramadzyan)

У Віцебску адкрылася ўнікальная ўстанова адукацыі (/be/news/20240902/1725268034-u-vicebsku-adkrylasya-unikalnaya-ustanova-adukacyi)

(https://declarant.by/ru/)

Выбар рэдакцыі

У свеце (/be/u-svece)

(/be/news/20240930/1727708155-chzhan-venchuan-kitayska-belaruskae-supracounictva-uzor-mizhnarodnyh)

Чжан Вэньчуань: Кітайска-беларускае супрацоўніцтва — узор міжнародных адносін новага тыпу (/be/news/20240930/1727708155-chzhan-venchuan-kitayska-belaruskae-supracounictva-uzor-mizhnarodnyh)

У чым асаблівасці кітайскай мадэрнізацыі, якія перспектывы ўзаемадзеяння Кітая і Беларусі расказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэнь чуань.

0 112

Жыллё (/be/zhyllyo-0)

(/be/news/20240930/1727703386-arendu-pa-voseni-lichac)

Колькі кватэр у арэнду прапаноўвалася ў жніўні і якія цэны вызначылі ўласнікі ў аб'явах? (/be/news/20240930/1727703386-arendu-pa-voseni-lichac)

Цэны на ліквіднае жыллё ў сталіцы выраслі на 5 працэнтаў.

0 64

Культура (/be/kuttura)

(/be/news/20240930/1727697177-dekret-naylepshy-chas-stac-pismennikam)

Дэкрэт — найлепшы час стаць пісьменнікам (/be/news/20240930/1727697177-dekret-naylepshy-chas-stac-pismennikam)

Магіляўчанка Вольга Смалякова пра любоў да чытання, рамантыку і свой літаратурны дэбют.

0 93

Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)

(/be/news/20240927/1727439622-ushodni-garaskop-na-nastupny-tydzen)

Усходні гараскоп на наступны тыдзень (/be/news/20240927/1727439622-ushodni-garaskop-na-nastupny-tydzen)

У Цяльцоў у пачатку і канцы тыдня могуць узнікнуць напружаныя сітуацыі на рабоце

(https://declarant.by/ru/)

0 155

Нашы партнёры:

(https://center.gov.by/) (http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://wwv

ЗВЯЗДА (/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2024 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)
Экстрэмісцкія матэрыялы (/be/page/respublikanski-spis-ekstremisckih-materyyalau)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

5 743
3 787
3 611
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://t.me/zviazda_online)